Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

Зборнік навуковых прац

Мінск
2015

УДК 001–021.121
ББК 72
А437

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Р э д к а л е г і я :
доктар педагагічных навук, прафесар *Г. В. Торхава* (адк. рэд.);
доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар *І. С. Ташлыкоў;*
доктар філалагічных навук, прафесар *В. Д. Старычонак;*
доктар псіхалагічных навук, дацэнт *А. П. Лабанаў*

Р э ц э н з е н т ы :
доктар філалагічных навук, прафесар *А. А. Гіруцкі;*
доктар біялагічных навук, прафесар *В. М. Нікандраў;*
доктар гістарычных навук, прафесар *Г. А. Космач;*
доктар педагагічных навук, прафесар *І. І. Цыркун;*
доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар *М. Г. Ясавееў*

Актуальныя пытанні сучаснай навукі : зб. навук. прац / рэдкал. :
А437 Г. В. Торхава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2015. – 332 с.
ISBN 978-985-541-213-8.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы, прысвечаныя даследаванням у галіне грамадскіх навук, педагогікі, псіхалогіі, філалогіі, фізікі і прыродазнаўства.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам ВНУ, усім, хто цікавіцца надзённымі пытаннямі сучаснай навукі.

УДК 001–021.121
ББК 72

ISBN 978-985-541-213-8

© БДПУ, 2015

АДЛЮСТРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ Ў АДУКАЦЫІ І ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

П. А. Мацюш

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння беларускіх земель у склад Расійскай імперыі быў устаноўлены новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, змянілася дзяржаўная мова, была ўведзена ваенная павіннасць, новыя падаткі. Нягледзячы на гэта на беларускіх землях працягваў дзейнічаць Статут ВКЛ 1588 г., у духоўным жыцці значны ўплыў мелі каталіцкая і ўніяцкая царква, функцыянавала былая, канчаткова склаўшаяся ў канцы XVIII ст. сістэма сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

Цэнтрам ліберальнай думкі таго часу стаў Віленскі ўніверсітэт (1803–1832), вакол якога групаваліся беларускія, літоўскія і польскія асветнікі.

Вялікую ролю ў фарміраванні ў выкладчыцкім і студэнцкім асяроддзі асветніцкіх і ліберальных традыцый аказваў рэктар універсітэта (з 1807 па 1815 гг.) выдатны матэматык, астраном, філосаф, псіхолаг Ян Снядэцкі (1756–1830).

У выхаванні сапраўдных патрыётаў і грамадзян ён вялікую ролю адводзіў мастацкаму слову. Па тэарэтычных праблемах мастацкай літаратуры Ян Снядэцкі напісаў такія спецыяльныя працы, як «Пра літаратуру», «Пра творы класіцызму і рамантызму» і інш. Як прыхільнік ліберальных ідэй Я. Снядэцкі выступаў за вызваленне навукі і адукацыі ад празмернай апекі дзяржавы [4, с. 181].

Для дзейнасці Я. Снядэцкага ў якасці рэктара быў характэрны клопат аб падрыхтоўцы навукоўцаў з мясцовай моладзі. Традыцыя фарміраваць уласныя кадры, пачатая ў час рэктарства Я. Снядэцкага, існавала да закрыцця ўніверсітэта ў 1832 г.

У 20-х гг. XIX ст. сярод выкладчыкаў Віленскага ўніверсітэта беларускага паходжання пашыраюцца намаганні выявіць і сістэматызаваць помнікі старажытнай пісьменнасці, выспявае думка аб узнаўленні і літаратурнай творчасці на беларускай

мове. У абуджэнні цікавасці да беларусазнаўства асобае месца займае выкладчыцкая і навуковая дзейнасць Міхаіла Баброўскага (1784–1848).

Міхаіл Баброўскі ўсё сваё жыццё прысвяціў выяўленню, вывучэнню і збіранню помнікаў стараславянскай пісьменнасці. Менавіта з яго імем звязаны знаходка Супрасльскага рукапісу, вяртанне беларускай і еўрапейскай навуцы імя Францыска Скарыны, апісанне глагалічных і кірылічных кніг і інш. Нягледзячы на страчаную спадчыну, М. Баброўскі ўнёс вялікі ўклад у фарміраванне інтарэсу да гісторыі і культуры беларускага народа, яго навуковая дзейнасць спрыяла развіццю беларускай свядомасці. Вынікі даследаванняў прафесара прынеслі яму заслужаную павагу сярод акружаючых. Практычнае прымяненне поглядаў М. Баброўскага знайшло адлюстраванне ў выкладчыцкай дзейнасці, дзе ім уводзіліся толькі самыя новыя і праверaныя метады навучання для студэнтаў універсітэта. Уменне весці спрэчкі вучоны даказаў падчас канфлікту з базыльянскім ордэнам, праяўляючы стрыманасць і вытрымку. М. Баброўскага можна назваць піянерам айчыннай і сусветнай славістыкі, самым буйным беларускім славістам і арыенталістам першай паловы XIX ст., які ўсё сваё жыццё прысвяціў «умножению плодов славянской литературы» [3].

Значны ўплыў на фарміраванне гістарычнай свядомасці беларускай студэнцкай моладзі зрабілі працы і выкладчыцкая дзейнасць аднаго з буйнейшых спецыялістаў па гісторыі права Беларусі і Літвы – Ігната Мікалаевіча Даніловіча (1787–1843).

І. Даніловіч з 1814 г. выкладаў мясцовае права ў Віленскім універсітэце. У 1814 г. ён быў прызначаны ў склад прафесійнай камісіі, якая была створана для перакладу на рускую мову Статута ВКЛ 1588 г. З гэтага часу асноўным яго заняткам стаў пошук крыніц па гісторыі права ВКЛ.

У сваіх працах і лекцыях Даніловіч праводзіў думку аб тым, што права ВКЛ грунтавалася на старажытным славянскім праве. Ён падкрэсліваў усебаковую распрацаванасць права ВКЛ, марыў вярнуць да жыцця мову статутаў, падтрымліваў ідэю аб адзінстве славянскага права. Ім быў падрыхтаваны «Гістарычны агляд літоўскага заканадаўства», які выйшаў у свет у 1857 г.

І. Даніловіч пачаў збіраць, вывучаць і публікаваць пісьмовыя крыніцы па гісторыі беларуска-літоўскіх зямель. Вядома, што студэнты прывозілі свайму настаўніку пергаментныя рукапісы пераважна з уніяцкіх цэркваў і манастыроў. Рукапісныя крыніцы ён класіфікаваў і крытычна разбіраў. Разам з М. Баброўскім І. Даніловіч пачаў рыхтаваць да выдання помнікі заканадаўства ВКЛ.

Ігнат Даніловіч адным з першых пачаў вывучаць агульнадзяржаўнае летапісанне ВКЛ. Разам з М. Баброўскім у 1827 г. апублікаваў Супрасльскі летапіс пад назвай «Летапісец Літвы і Руская хроніка». Археаграфічная дзейнасць вучонага знайшла адлюстраванне ў зборніку пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі і Літвы «Скарбніца грамат», які ўключае 2500 дакументаў – ад выпісак з Геродота да актаў 1569 г. Вядомы расійскі даследчык М. Уладзімірскі-Буданаў назваў Ігната Даніловіча «патрыётам-ліцвінам, грамадзянінам ВКЛ» [2].

Ідэйна блізкі да Даніловіча быў яго сучаснік, ваенны інжынер Тэадор Нарбут (1784–1864). У 1812 г. ён пачаў займацца даследаваннем гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Ён напісаў і апублікаваў «Старажытную гісторыю літоўскага народа» ў 9 тамах, у якой асвятляліся гістарычныя падзеі да 1569 г. Час ВКЛ, асабліва перыяд XVI ст., Нарбут лічыў «залатым стагоддзем беларускай гісторыі». Ён адмоўна ставіўся да палітыкі польскіх феадалаў у адносінах да ВКЛ.

Такім чынам, заслугай Даніловіча, Нарбута з'яўляецца тое, што яны сабралі і высветлілі цэлы шэраг фактаў дзяржаўна-прававой гісторыі Беларусі, паклалі пачатак фарміравання новага, нацыянальнага кірунку ў гісторыяграфіі дзяржавы і права Беларусі, імкнуліся даказаць неабгрунтаванасць польскай канцэпцыі гісторыі ВКЛ як часткі польскай гісторыі.

Да зараджэння першых праяў беларускага руху мелі дачыненне тайныя гурткі і таварыствы, якія дзейнічалі ў 1817–1823 гг. у Віленскім універсітэце. Першымі з такіх таварыстваў былі філаматы (аматары навук). Ля вытокаў арганізацыі стаялі студэнты ўніверсітэта – выхадцы з Беларусі – Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ігнацій Дамейка, Ян Чачот.

Дзейнасць арганізацыі філаматаў, як і філарэтаў (аматараў дабрачыннасці), «Прамяністых» і іншых арганізацый, якія

выйшлі з-пад яе крыла, прадугледжвала дзве мэты. З аднаго боку, яны імкнуліся да самаўдасканалення як навуковага, так і маральнага. У адукацыі і маральным удасканаленні яны бачылі галоўнае выратаванне чалавечага грамадства ўвогуле і ліцвінскага у прыватнасці, яны распаўсюджвалі адукацыю ў сялянскім асяроддзі, знаёмілі простага чалавека з літаратурай, мастацтвам, рамёствамі. Выхаванне і навучанне, на іх думку, павінна было садзейнічаць палітычнаму ўдасканаленню грамадства, далучэнню да барацьбы супраць дэспатызму і нацыянальнага ўціску шырокага кола жыхароў Беларусі.

З другога боку, члены тайных таварыстваў марылі аб скасаванні прыгонніцтва, звяржэнні самаўладдзя, увядзенні канстытуцыйнай формы кіравання, зацвярджэння ў краіне прынцыпу вяршэнства закона. «Сёння – права сілы, а заўтра – сіла права», – пісаў А. Міцкевіч у 1820 г. у «Песні філарэтаў».

Разам з тым філарэты падкрэслівалі ролю гуманістычнай маралі як рэгулятара грамадскіх адносін. У артыкуле Яна Чачота «Пра будучае прызначэнне таварыства філаматаў» гаварылася, што сапраўдны грамадзянін «паводзіць сябе не толькі згодна ўстаноўленым грамадскім законам, але і згодна законам сумлення, маралі і рэлігіі... Грамадскае шчасце залежыць як ад добрых грамадзян, так і ад добрага ўрада».

Погляды філаматаў і філарэтаў добра характарызуюць іх праграмы, сачыненні, вершы, рэфераты, з якімі яны выступалі на сваіх пасяджэннях. Ян Чачот, акрэсліваючы задачы таварыства, пісаў, што «яно павінна ўсё рабіць для шчасця і вызвалення Айчыны ... пры дапамозе асветы і згуртавання суайчыннікаў». Філаматы свае намаганні марылі накіраваць на адраджэнне Рэчы Паспалітай, у якой Вялікае Княства Літоўскае будзе мець аўтаномны статус. Барацьбу павінна была ўзначаліць выключна шляхта.

Адчуваючы сваю генетычную сувязь з беларускім народам, філаматы дасканала вывучалі гісторыю краю, асабліва часоў ВКЛ, даследавалі беларускі фальклор, вераванні і звычаі народа.

Як вядома, дзейнасць тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў была выкрыта царызмам у 1823–1824 гг., яны былі забаронены, а многія з іх удельнікаў апынуліся пад следствам.

У першай палове XIX ст. назіраецца паварот беларускай шляхты і інтэлігенцыі да «сялянскай» культуры. З цікавасці да багатага беларускага фальклору ў аматараў роднага слова ўзнікла імкненне паспрабаваць уласныя сілы ў літаратурнай творчасці на беларускай мове.

Адной з карэнных праблем беларускай літаратуры стала праблема нацыянальнай самабытнасці, народнасці. Паклаўшы ў сваю аснову народны беларускі фальклор, беларуская літаратура сцвярджала «неўміручасць народа», яго мудрасць, таленавітасць, жыццярадаснасць, дасціпнасць [1, с. 127–129].

З фальклярыстыкай была звязана творчасць беларускага шляхціча, удзельніка паўстання 1830–1831 гг. Аляксандра Рыпінскага (1811–1896). Ён выдаў у эміграцыі ў Парыжы кнігу «Беларусь. Некалькі слоў аб паэзіі простага люду гэтай нашай польскай правінцыі, аб яго музыцы, спевах, танцах і г. д.». У 1853 г. Рыпінскі выдае ў Лондане беларускую баладу «Нячысцік». У канцы жыцця Рыпінскі займаўся напісаннем гісторыі беларускай літаратуры, дапамагаў маладым беларускім літаратарам.

На падставе народных легенд і казак Янам Баршчэўскім (1790–1851) была створана «беларуская Адысея» – чатырохтомны польскамоўны зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Неацанімую ролю ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці беларусаў, росту зацікаўленасці іх да духоўнай спадчыны краю адыгралі ананімныя творы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Усе гэтыя творы сведчылі аб высокім выяўленчым патэнцыяле беларускай мовы, магчымасці стварэння на ёй самабытнай мастацкай літаратуры.

Фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў сродкамі новай беларускай літаратуры ішло праз выхаванне ў іх патрыятычных пачуццяў. Усе пісьменнікі-рамантыкі першай паловы XIX ст. былі патрыётамі бацькаўшчыны. Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч падкрэслівалі сваё ліцвінскае паходжанне, ганарыліся сваёй радзімай, яе гісторыяй, прыродай, народам [1, с. 136].

Любоў да радзімы выяўлялася праз гонар яе гісторыяй, славутымі, гераічнымі справамі продкаў. Паэты і пісьменнікі ў сваіх творах папярэджвалі чытачоў, што пад кожным кавал-

кам роднай зямлі ляжыць святы прах далёкіх продкаў, што сваім жыццём яны плацілі за волю Радзімы, за яе будучыню.

Такім чынам, у пачатку XIX ст. значны ўклад у фарміраванні беларускай нацыянальнай ідэі ўнеслі некаторыя з беларускіх прафесараў Віленскага ўніверсітэта і найперш Міхаіл Баброўскі, Тэадор Нарбут, Ігнат Даніловіч. Яны выказалі шэраг каштоўных тэарэтычных палажэнняў адносна самабытнасці беларускага этнасу. На іх працах вучыліся шанаваць уласную спадчыну сябры тайных студэнцкіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Асабліва вялікая заслуга згаданых навукоўцаў у даследаванні гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. У творах гэтых вучоных дадзеная дзяржава з яе параўнальна развітымі для таго часу палітычнай сістэмай, эканомікай і культурай характарызуецца самай адметнай з'явай у гісторыі Беларусі.

Відавочна і тое, што дзякуючы развіццю літаратуры, у першай палове XIX ст. паступова пачынаецца культурна-нацыянальнае адраджэнне Беларусі, якое праяўляецца праз вяртанне да гістарычна-культурных традыцый беларускага народа, фарміраванне яго этнічнай свядомасці, паступовай кансалідацыі беларускага нацыі.

Літаратура

1. Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : дапам. для студ. ВНУ / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2004. – 271 с.

2. Караў, Дз. Пачаткі беларускага крыніцазнаўства / Дз. Караў // Спадчына. – 1994. – № 1. – С. 4–14.

3. Лабынцев, Ю. А. Первая книга, напечатанная глаголицей, и ее исследователь Михаил Бобровский / Ю. А. Лабынцев // Советское славяноведение. – М., 1983. – № 4. – С. 86–93.

4. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск : Маладзёжнае навуковае супольніцтва, 2002. – 247 с.

8,9

ГРАМАДСКІЯ ДЗЕЯЧЫ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVIII ст. У КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАГА АСВЕТНІЦТВА

П. А. Мацюш

Асветніцтва традыцыйна лічыцца адной з ключавых эпох у гісторыі еўрапейскай культуры, звязанай з развіццём навуковай, філасофскай і грамадскай думкі. У аснове гэтага інтэлектуальнага руху ляжалі рацыяналізм і вальнадумства.

У эпоху Асветніцтва адбывалася адмова ад рэлігійнага светаразумення і зварот да розуму як да адзінага крытэрыя пазнання чалавека і грамадства. Упершыню ў гісторыі было пастаўлена пытанне аб практычным выкарыстанні дасягненняў навукі ў інтарэсах грамадскага развіцця.

Асветніцтва ўзнікла ў заходнееўрапейскіх краінах (Англія, Францыя і інш.). Асветнікі выказваліся за ўстанаўленне «царства розуму», заснаванага на прынцыпах свабоды, братэрства і роўнасці ўсіх людзей, арыентаваліся на прынцып «натуральнага права», паводле якога кожны чалавек мае права на асабістую свабоду і поўнае выяўленне сваіх здольнасцей, поглядаў. Яны выкарыстоўвалі навуковыя адкрыцці і дасягненні ў галіне прыродазнаўства, гуманітарных ведаў у барацьбе супраць феадальна-царкоўнай ідэалогіі, абсалютысцкіх рэжымаў, схаластычных метадаў адукацыі і выхавання, дагматычнага мыслення.

XVIII ст. увайшло ў гісторыю як «эпоха Асветніцтва», падчас якой сфармавалася адмысловая культура Асветніцтва, для якой было характэрна ўзмацненне свецкіх пачаткаў, большая вытанчанасць, лёгкасць і меншая ўзвышанасць.

У эпоху Асветніцтва ідэалам чалавека лічылася адукаваная, высокакультурная асоба, якая схільная да прагрэсіўных наваўвядзенняў, вызначаецца рацыяналістычным мысленнем, скептычнымі адносінамі да рэлігійных догмаў.

Ідэі Асветніцтва ляжаць таксама ў аснове палітычных свабод і дэмакратыі як базавых каштоўнасцей сучаснага грамадства, а таксама арганізацыі дзяржавы як самакіравальнай рэспублікі, рэлігійнай талерантнасці, рынкавых механізмаў, капіталізму,

навуковага метаду. Пачынаючы з эпохі Асветніцтва, мысліцелі настойваюць на сваім праве шукаць ісціну, якой бы яна ні была і чым бы яна ні пагражала грамадскім асновам, не падвяргаючыся пры гэтым пагрозам быць пакаранымі «за Праўду» [4, с. 136].

На Беларусі ідэі Асветніцтва распаўсюдзіліся ў другой палове XVII – пачатку XIX ст. і былі цесна звязаныя як з усходнеславянскім, так і з заходнееўрапейскім Асветніцтвам. Яны знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, літаратуры і мастацтве, вызначаліся паказам бытавых і этнічных умоў жыцця класаў і сацыяльных груп, праблем аўтаномнасці і адносін да Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, успрыняцця духоўнай спадчыны мінулага, суіснавання розных пластоў у нацыянальнай культуры. Ідэйныя вытокі Асветніцтва на Беларусі ідуць ад творчасці і дзейнасці мысліцелей канца XVII – пачатку XVIII ст. К. Лышчынскага, С. Полацкага, І. Капіевіча.

Асветніцкая ідэалогія была накіравана супраць магнацкай алігархіі і клерыкалізму, перажыткаў прыгонніцтва. Зыходзячы з тэорыі натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы, яе прадстаўнікі прапаноўвалі розныя праекты рэфармавання грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай з улікам вопыту буржуазных краін Заходняй Еўропы. У гэты перыяд з'яўляюцца новыя плыні ў грамадскай думцы, прадпрымаюцца спробы надаць адукацыі свецкі характар. У Рэчы Паспалітай прымаецца першая ў Еўропе Канстытуцыя.

Распаўсюджванне ідэй асветніцтва на тэрыторыі Беларусі адбываецца з другой паловы XVIII ст. Яскравымі прадстаўнікамі гэтага перыяду былі С. Ляшчынскі, С. Канарскі, І. Страйкоўскі, А. Тызенгаўз, М. Пачобут-Адляніцкі і інш [1, с. 132].

Значную асветніцкую і навуковую спадчыну пакінуў сваім нашчадкам Марцін Пачобут-Адляніцкі – астраном і асветнік, «заснавальнік Астранамічнай школы ў Вільні».

У 1751 г. пачалася ягоная выкладчыцкая дзейнасць. Тры гады будучы даследчык космасу вучыў у пачатковых класах Полацкага, а пасля і Віленскага калегіумаў. Верагодна тады Марцін Пачобут зацікавіўся астраноміяй. Неўзабаве яго самога паслалі ўдасканальваць веды з матэматыкі і класічных моваў у Пражскі ўніверсітэт, якім апекаваліся езуіты. Там наш зям-

ляк слухаў і лекцыі Стэлінга па астраноміі. Пасля вяртання на радзіму ён выкладаў у Віленскай акадэміі грэчаскую мову і адначасова сам вывучаў тэалогію. У 1760 г. Марцін Пачобут быў высвечаны на ксяндза, а ў студзені наступнага, абараніўшы дысертацыю, стаў бакалаўрам тэалогіі. Улетку таго ж года Марціна паслалі дзеля далейшай вучобы за мяжу. Пачаліся вандраванні па Еўропе. Свае веды малады навуковец удасканальваў у вядомых астраномаў Італіі, Францыі, дзе два гады практыкаваўся ў знакамітага марсельскага гідрографа і астранома ксяндза Э. Пезена і працаваў у абсерваторыі горада Авіньёна. Пасля вяртання ў Вільню ў 1764 г. Марцін Пачобут заняў кафедру матэматыкі і астраноміі, быў прызначаны дырэктарам абсерваторыі. Знаёмы са станам лепшых падобных навуковых установаў Еўропы, ён імкнуўся і Віленскую абсерваторыю зрабіць узорнай. У тым жа годзе пачаліся бесперапынныя назіранні планет Сонечнай сістэмы і зорак. Усе звесткі дырэктар і ягоныя памочнікі запісвалі ў спецыяльны журнал «Cahiers des observations» («Журналы назіранняў»). Найперш Марцін Пачобут сачыў за Месяцам. На падставе гэтых назіраняў у 1766 г. ён вызначыў геаграфічныя шырыню і даўгату горада Вільні. (Дарэчы, з такой дакладнасцю, што толькі праз 63 гады тая лічба была ўдакладнена на дзве сякунды. Вынікі такіх назіранняў мелі вялікае практычнае значэнне для развіцця картаграфіі.) За што атрымаў званне каралеўскага астранома, абсерваторыя ж стала называцца каралеўскай. Праз чатыры гады за фінансавай дапамогай графіні Э.Агінскай-Пузынінай малады навуковец паехаў у Францыю, Галандыю і Англію з мэтай купіць навейшае абсталяванне, якое і атрымаў у 1770 г.

Дзеля стварэння адпаведных умоў работы абсерваторыі давялося перабудоўваць яе гмах. З таго часу пачынаецца рэгулярнае назіранне планет, асабліва Меркурыя. Гэтыя звесткі былі выкарыстаныя французскім астраномам Лаландам дзеля вызначэння арбіты Меркурыя. У сваёй кнізе «Bibliographie astronomique; avec l'histoire de l'astronomie» («Бібліяграфія астраноміі; разам з гісторыяй астраноміі») Ж. Лаланд высока ацаніў значэнне назіранняў віленскіх даследчыкаў. Марцін Пачобут стаў вядомым і паважаным навукоўцам. Яго абралі сябрам Лонданскага наву-

ковага таварыства, і таго ж 1770 г. загадам караля Станіслава Аўгуста быў выбіты медаль з партрэтам Марціна Пачобута. Такі гонар астраном заслужыў сваёй самаахвярнай працай, шчырай адданасцю навуцы.

Асобна трэба сказаць пра Марціна Пачобута-Адляніцкага як рэктара Акадэміі. Гэтую пасаду ён атрымаў 24 кастрычніка 1780 г. Тады ж Акадэмія была рэарганізавана ў Галоўную Школу ВКЛ. Для выкладання новы рэктар запрасіў вядомых вучоных, у тым ліку і батаніка Э. Жылібера. 30 жніўня 1781 г. М. Пачобут-Адляніцкі наладзіў кангрэс усіх рэктараў школ ВКЛ, на якім вядомы Яўхім Храптовіч расказаў пра мэты і задачы Нацыянальнай Адукацыйнай Камісіі – першага ў Еўропе таго часу міністэрства адукацыі. М. Пачобут-Адляніцкі вядомы і як апякун маладых навукоўцаў. Ягонымі вучнямі былі ўраджэнцы Беларусі Вінцэсь Карчэўскі, Міхал Глушневіч, Антон Шагін, Пётр Славінскі [3].

Выдатным дзеячам другой паловы XVII – другой паловы XIX ст. з'яўляўся *Іеранім Страйноўскі*. Ён вядомы як першы рэктар Віленскага ўніверсітэта. Прадпрымаў спробы пабудаваць на базе фізіякратызму ўласную філасофскую сістэму, якая аб'яднала б анталагічныя, антрапалагічныя і метадалагічныя пытанні. Аўтар працы «Навука аб натуральным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў» (Вільня, 1781). Прынцыпы натуральнага права І. Страйноўскі разглядаў у якасці крытэрыяў «ісціннасці» таго ці іншага сацыяльна-палітычнага ладу. Ён лічыў, што дзяржаўная сістэма Рэчы Паспалітай не адпавядае патрабаванням натуральнага права. І. Страйноўскі абгрунтоўваў залежнасць шчасця народа і разумнага грамадскага ўпарадкавання ад узроўню пашырэння ведаў аб прыродзе і грамадстве. Для ажыццяўлення плана асветы насельніцтва, на яго думку, неабходна стварыць дасканалую сістэму навучання юнацтва, садзейнічаць развіццю навукі і папулярызаваць яе праз выданне кніг [2, с. 122].

Буйным фінансістам і адміністратарам, адукаваным і культурным чалавекам свайго часу з'яўляўся *Антоній Тызенгаўз*. Антоній Тызенгаўз – вядомы рэфарматар, кіраўнік каралеўскіх эканомій у Беларусі. Заснаваў у Гродне Медыцынскую школу

і Інстытут павівальнага майстэрства, на чале якіх стаў французскі вучоны Жан Эмануэль Жылібер. Пасля адкрыў бухгалтарскую, землямерскую і будаўнічую школы, наладзіў у Гродне выданне першай у межах сучаснай Беларусі штотыднёвай газеты («Гродзенская газета»). Яе першы нумар выйшаў з друку ў маі 1776 г. На яе старонках асвятляліся палітычныя і прававыя ідэі [5, с. 62].

Такім чынам, у Беларусі ідэі Асветніцтва распаўсюдзіліся ў XVIII – пачатку XIX ст. і былі цесна звязаны як з усходнеславянскім, так і з заходнееўрапейскім Асветніцтвам. Яны знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, літаратуры і мастацтве, успрыняцці духоўнай спадчыны мінулага, суіснаванні розных пластоў у нацыянальнай культуры. У гэты час з'яўляюцца новыя плыні ў грамадскай думцы, прадпрымаюцца спробы надаць адукацыі свецкі характар.

Аднак новыя тэндэнцыі не маглі рэалізавацца ў грамадска-палітычным жыцці так, як гэта было ў заходнееўрапейскіх краінах, таму што сацыяльныя сілы, зацікаўленыя ў рэфармаванні грамадства, былі слабымі і пазбаўленымі дзяржаўнай падтрымкі, паколькі да канца XVIII ст. Рэч Паспалітая канчаткова страціла сваю незалежнасць.

Літаратура

1. Басюк, І. А. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : курс лекцый / І. А. Басюк. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 282 с.

2. Вонсович, Л. В. Белорусоведение : учеб. пособие / Л. В. Вонсович. – Минск : ТетраСистемс, 2005 – 224 с.

3. Лаўрэш, Л. Марцін Пачобут-Адляніцкі / Л. Лаўрэш // Наша слова. – 2009. – № 9. – С. 6–7.

4. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С. А. Падокшын. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 316 с.

5. Шыдлоўскі, С. А. Гісторыя грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя» С. А. Шыдлоўскі. – Наваполацк : ПДУ, 2012. – 148 с.